

*Гальшанскі замак. Фота М. Гальпяровіча (2022 г.)*

# Няпросты лёс Лідскага, Гальшанскага і Любчанскага замкаў

***У № 26 «Краязнаўчай газеты» за гэты год мы пісалі пра рэстаўрацыю Нясвіжскага і Мірскага замкаў. У гэтым артыкуле звернемся да лёсу замкаў, якім пашанцавала менш. На працягу свайго існавання яны зведалі значныя разбурэнні. Цяпер адрэстаўраваны Лідскі замак ужо жыве новым, сучасным жыццём, а Гальшанскі і Любчанскі рэстаўруюцца і аднаўляюцца.***

Складаны шлях кансервацыі і рэстаўрацыі прайшоў Лідскі замак. Гэты замак-кастэль быў узведзены пры вялікім князі літоўскім Гедыміне ў пачатку XIV стагоддзя каля паселішча Ліда на пясчанай выспе (дзюне) у балоцістай сутоцы рэчак Лідзейка і Каменка. Ён меў памеры прыкладна 80х80 м і будаваўся 5-7 гадоў з палявога каменю і тоўстай цэглы. Таўшчыня сцен унізе складае 2 м, уверсе яны звужаюцца да 1,5 м і пераходзяць у баявую галерэю. Спачатку замак меў толькі адну вежу – у паўднёва-заходнім куце двара памерам 9х9 м. У канцы XIV – пачатку XV стагоддзя пры вялікім князі літоўскім Вітаўце яго капітальна перабудавалі і прыстасавалі да агнястрэльнай зброі. Была збудавана яшчэ адна вежа – паўночна-ўсходняя. Унутры замка да яго сцен прымыкалі драўляныя аднапавярховыя будынкі (казармы) шырынёй каля 4 м. Таксама тут быў асобны будынак на каменных падмурках (6х4 м), дзе мог жыць камендант (кашталян). Ва ўсходняй частцы двара былі два калодзежы.

У XIV – XV стагоддзях Лідскі замак быў адным з самых значных у ВКЛ. Летам 1659 года пад час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай яго ўзяло ў аблогу вялікае войска царскага ваяводы Мікіты Хаванскага, якое захапіла і разбурыла замак. У пачатку XVIII стагоддзя, ужо ў Паўночную вайну, шведскія войскі, якія занялі замак, узарвалі яго вежы. Аднак яшчэ ў канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзя замкавыя сцены стаялі, а рэшткі вежаў захоўваліся да ўзроўню трэцяга паверха. Замак не раз малявалі мастакі, вывучалі гісторыкі. У 1891 годзе Ліда моцна згарэла, і гарадскія ўлады пачалі разбіраць муры замка на будаўнічыя матэрыялы. Аднак грамадскасць горада пачала скардзіцца ў Санкт-Пецярбург, і разбурэнне замка спынілася. Прыехалі навукоўцы, сярод іх быў Пётр Пакрышкін, які зрабіў абмеры муроў і іх фотафіксацыю. У 1909 годзе замак ачысцілі ад смецця, а паверхні сцен абмазалі цэментнай рошчынай, якая стала прыцягваць вільгаць і паскорыла разбурэнне муроўкі.

У 1920-я гады польскія кансерватары крыху паднавілі муры замка, злучылі каменнай агароджай заходнюю і паўднёвую сцены, часткова залажылі разбураны паўднёва-ўсходні кут і замуравалі бакавыя ўваходы. У замак вяла драўляная брама, зробленая на месцы разбуранага паўночна-заходняга замкавага кута. Летам тут мог працаваць вандроўны цырк, альбо звярынец, а зімою залівалі каток. У гады Вялікай Айчыннай вайны нацысты спачатку трымалі на замкавым двары ваеннапалонных, а потым зрабілі склады боепрыпасаў.

У 1953 годзе Лідскі замак узялі пад дзяржаўную ахову, а ў 1967-м перадалі пад нагляд мясцоваму будаўнічаму трэсту, які зрабіў на двары спартыўную пляцоўку. Першыя археалагічныя раскопкі тут праводзілі Міхась Ткачоў (1970 г.) і Яраслаў Звяруга (1974 г.). Аднак замак працягваў разбурацца.

***(Заканчэнне на стар. 3)***

# Няпросты лёс Лідскага, Гальшанскага і Любчанскага замкаў

**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)**



*Любчанскі замак. Фота 1900 г.*

У 1975 годзе гарадскія ўлады Ліды вырашылі зрабіць кансервацыю замка і звярнуліся ў Міністэрства культуры БССР. Навуковым кіраўніком быў прызначаны архітэктар Сяргей Баглаcаў, а гісторыкам і археолагам – аўтар гэтай публікацыі. У 1977 – 1978, а таксама ў 1980 і 1985 гадах былі праведзены вялікія раскопкі на замкавым двары, расчышчаныя рэшткі замкавых вежаў, сабраны значны археалагічны матэрыял XIV – XVII стагоддзяў. Упершыню ў Беларусі быў створаны спецыяльны студэнцкі будаўнічы атрад імя У. І. Пічэты на базе гістарычнага факультэта БДУ, які прымаў актыўны ўдзел у раскопках і будаўнічых работах. Летам 1978 года ў Лідзе быў створаны вытворчы ўчастак для рэстаўрацыйных работ. Дапамагала адбудоўваць замак кіраўніцтва горада, асабліва старшыня гарвыканкама Уладзімір Логаш і галоўны архітэктар Анатоль Пархута. Кансервацыю замка меліся завяршыць да 1985 года. На яго тэрыторыі меркавалі зрабіць гісторыка-археалагічны музей з паказам на мясцовасці планаў былой замкавай драўлянай забудовы. У цэнтры замкавага двара хацелі размясціць адкрыты гарадскі тэатр. Аднак фінансаванне рэстаўрацыйных работ у сярэдзіне 1990-х гадоў спынілася і пачалося разбурэнне незакончаных замкавых муроў. Новы праект поўнага аднаўлення замка падрыхтавалі ў 2003 годзе.

У верасні 2005 года ў Лідзе прайшоў фестываль сярэднявечнай культуры «Замак Гедыміна». Сродкі, атрыманыя ад яго правядзення, былі патрачаныя на рэканструкцыю Лідскага замка. За два дні фестывалю ў замку пабывала 10 тысяч гледачоў. Неўзабаве супрацоўнікі Лідскага гісторыка-мастацкага музея пачалі ладзіць тут рэгулярныя экскурсіі. У траўні 2007 года ў Лідскім замку прайшоў рыцарскі фэст. Асноўныя рэстаўрацыйныя работы праходзілі ў замку вясной і летам 2010 года. Дабудавалі паўднёва-заходнюю вежу, усе сцены з драўлянай галерэяй, прывялі ў парадак замкавы двор. Скончылася рэстаўрацыя ў 2019 годзе. Замак стаў цэнтрам рыцарскіх фэстаў, тут дзейнічае музейная экспазіцыя.

Старажытнае беларускае мястэчка Гальшаны ў 1555 годзе стала ўласнасцю знакамітых беларускіх магнатаў Сапегаў. Адзін з іх канцлер ВКЛ Павел Сапега ў пачатку XVII стагоддзя будуе тут сваю рэзідэнцыю – палацава-паркавы комплекс бастыённага тыпу. За землянымі ўмацаваннямі ўзведзены трохпавярховы палац з вялікімі вокнамі, уязной брамай, галерэямі, невялікай капліцай (насупраць галоўнага ўвахода ў замкавы дворык) і вежамі па кутах. Інтэр'еры замка мелі шыкоўныя кафляныя печы, аблямаваныя паліхромнай кафляй з гербам Сапегаў, падлогі з паліваных плітак-цаглін, скляпенні, зробленыя ў галандскім стылі. У Паўночную вайну замак разбурылі шведскія войскі, былі тут і напалеонаўскія салдаты ў 1812 годзе. Замак занепаў, і новыя гаспадары яго не шкадавалі. У 1880 годзе адзін з іх, памешчык Гарбанёў, пачаў ламаць вежы і сцены, а цэглу прадаваў на пабудову карчмы. У XX стагоддзі, калі пасля апошняй вайны ацалелую частку палаца перадалі пад вучылішча, вучняў прымушалі таксама разбіраць замкавыя муры на цэглу для пабудовы на месцы замка кароўніка і Дома культуры ў цэнтры Гальшанаў. Вадкі гной з фермы вылівалі прама на былы замкавы двор і ў замкавыя лёхі. Здавалася, што замак нічога не ўратуе. Аднак у 1980-я гады сюды прыйшлі археолагі і рэстаўратары, зрабілі археалагічныя раскопкі, архітэктурныя абмеры і прапанавалі рэканструкцыю былога палаца Сапегаў у стылі галандскага маньерызму.

Пасля 1991 года былы кароўнік закрылі. Мясцовыя жыхары хутка разабралі яго сцены, а назапашаны гадамі гной вывезлі на свае палеткі. Паступова замак становіцца турыстычным аб'ектам, а каля яго муроў кожнае лета адбываюцца гістарычныя фестывалі. Грамадскасць патрабуе захавання замкавых муроў. У чэрвені 2016 года паводле Пастановы Савета Міністраў з рэспубліканскага бюджэту былі вылучаны сродкі на кансервацыю Гальшанскага замка. У 2018 годзе зрабілі гідраізаляцыю падмуркаў, аднавілі паўночную вежу, умацавалі яе перакрыцці, зрабілі над ёю дах з прыгожым флюгерам. 6 мая 2021 года адбылося ўрачыстае адкрыццё Паўночнай вежы Гальшанскага замка і турыстычна-інфармацыйнага цэнтра пры ім.

У другой палове XVI стагоддзя каля мястэчка Любча на левым беразе Нёмана беларускі магнат Ян Кішка будуе каменны замак у стылі рэнесансу. Памеры яго блізкія да квадрата (85х85 м). Па кутах узвышаліся шмат'ярусныя вежы з байніцамі. Да паўночна-заходняга замкавага мура ў канцы XVI – пачатку XVII стагоддзя прыбудавалі каменны палац, накрыты пляскатай чырвонай дахоўкай. Падлогу зрабілі з тоўстых паліваных керамічных плітак, сцены замка і палаца былі атынкаваныя. Пазней замак перайшоў да Багуслава Радзівіла, які яго капітальна адрамантаваў пасля вайны 1654 – 1667 гадоў.

У XIX стагоддзі на тэрыторыі замка пабудавалі цагляны жылы корпус, які пацярпеў пад час Першай сусветнай вайны. Пазней яго аднавілі ў 1920-я гады.

Пасля апошняй вайны муры замка былі занядбаныя, пакуль на яго не звярнуў увагу Мікалай Вінар, які стварыў у Любчы гісторыка-краязнаўчы музей і дамогся аднаўлення галоўнай брамнай замкавай вежы. Пры яе аднаўленні знайшлі замкавы геральдычны ветранік (флюгер) з датай будаўніцтва «1581». Другім ініцыятарам аднаўлення замка стаў дырэктар завода «Лідсельмаш» Міхаіл Скрабец, які паходзіў з Любчы. Ён хацеў ператварыць замак у дом адпачынку з музеем і паркам. Ад 1986 года пачаліся археалагічныя раскопкі, архіўныя пошукі, натурныя даследаванні. Першы праект аднаўлення замка зрабіў архітэктар Л. Баркун. Замак хацелі аднавіць як палацава-паркавы комплекс па стане на пачатак XX стагоддзя і размясціць тут санаторый «Лідсельмаша». Аднак гэты праект не быў рэалізаваны.

У 2003 годзе быў створаны дабрачынны фонд «Любчанскі замак» на чале з Іванам Пячынскім, які таксама паходзіць з Любчы. З дапамогай выкладчыкаў і студэнтаў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта была зроблена праектная дакументацыя для далейшых рэстаўрацыйных работ. Наступны праект паўстаў у 2004 годзе як завяршэнне Кутняй вежы і пабудова абарончай сцяны паміж Кутняй і Брамнай вежамі. На аснове новых натурных даследаванняў 2009 – 2010 гадоў зрабілі карэкціроўку вышэйзгаданага праекта, які потым у 2013 годзе ўзгаднілі з Міністэрствам культуры. У 2011 – 2012 гадах археолагі знайшлі рэшткі мураванай сцяны паміж Брамнай і паўночна-заходняй вежамі, падмурак якой таксама выяўлены. На сёння аднаўлена Брамная вежа (памерам 10х10 м), што з паловы вышыні пераходзіць у васьмярык, завершаны рэнесансным купалам з ліхтаром. Таксама аднавілі квадратную ў плане (8,3х8,3 м) паўднёва-ўсходнюю вежу XVII стагоддзя, ад якой засталіся толькі падмуркі. На адбудове замка больш за 20 гадоў працуюць валанцёры і вучні Любчанскай сярэдняй школы.

У двух артыкулах мы расказалі пра лёс пяці беларускіх замкаў. Але з імі хоць працавалі і працуюць. А колькі замкаў у Беларусі не ведаюць ні кансервацыі, ні рэстаўрацыі? А гэта наша спадчына…

***Алег ТРУСАЎ***



*Вінцэнт Дмахоўскі. Лідскі замак. 1850-я гг.*



*Лідскі замак. Фота Сяргея Плыткевіча*